# «НАМ ПЕРАКЛАДЧЫКІ НЕ ПАТРЭБНЫЯ!»

**У ПОЛЬСКІМ прыгранічным горадзе Бяла-Падляска адбылася сустрэча беларускіх прадпрымальнікаў — кіраўнікоў і вядучых спецыялістаў прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнэсу будаўнічага профілю — з членамі Бяла-Падляскай гаспадарчай палаты.**

— Для нас вельмі важна развіваць паспяховае супрацоўніцтва з Беларуссю, — сказаў, звяртаючыся да ўдзельнікаў гэтай дзелавой сустрэчы, Стараста Бяльскі Тадэвуш Лазоўскі. — І многія фірмы ў нас ужо актыўна ўзаемадзейнічаюць з беларускімі дзелавымі партнёрамі. Адбываецца гэта на фоне інтэнсіўнага развіцця эканомік як у Польшчы, так і ў Беларусі. Мы жывём на мяжы, таму актыўней, чым з іншымі беларускімі рэгіёнамі, супрацоўнічаем з Брэстам. Цяпер чакаем падпісання польска-беларускага пагаднення аб прыгранічным перамяшчэнні, якое павінна адкрыць новыя магчымасці як у развіцці ўзаемнага турызму, так і ў іншых кірунках узаемадзеяння. Нас аб'ядноўвае не толькі Белавежская пушча, але і агульная культура, гісторыя. Гэта ж факт: нам не патрэбныя перакладчыкі! Я перакананы, што, нягледзячы на любыя крызісы, паміж нашымі краінамі аб'ём супрацоўніцтва будзе толькі нарастаць. А будзе добры гандаль — будзем і жыць добра!



Стараста Бяльскі Тадэвуш ЛАЗОЎСКІ звяртаецца да беларускіх і польскіх прадпрымальнікаў, адкрываючы дзелавую сустрэчу ў Бяла-Падлясцы.

— У апошнія гады кантакты ў бізнэсе і эканоміцы паміж дзелавымі людзьмі нашых краін значна актывізаваліся, — падкрэсліў Консул Рэспублікі Беларусь у Бяла-Падлясцы Уладзімір Ананіч. — Толькі летась новыя дагаворы аб супрацоўніцтве падпісалі, у прыватнасці, гарады Люблін і Брэст, польская фірма «Гідрол» і беларускі восьмы трэст. Гэта сведчыць аб тым, што нават наяўны візавы рэжым не з'яўляецца перашкодай для бізнэсменаў. Але для нас таксама вельмі важна, каб у гэтым рэгіёне як мага хутчэй запрацаваў прыгранічнае перамяшчэнне без візаў. Гэта толькі ўзбагаціць кантакты беларускіх і польскіх прадпрымальнікаў новымі формамі ўзаемадзеяння.

Нагадаем, што ў ходзе нядаўняга візіту ў Беларусь намесніка старшыні Савета Міністраў Польшчы, міністра эканомікі Вальдэмара Паўляка было заяўлена, што Беларусь і Польшча ў найбліжэйшы час падпішуць дагавор аб правілах прыгранічнага перамяшчэння. Гэты дакумент створыць базу для паляпшэння адносінаў паміж грамадзянамі дзвюх краін. На думку польскага боку, прасоўваць і развіваць кантакты Беларусі і Польшчы трэба на ўсіх узроўнях — як паміж буйнымі кампаніямі, так і паміж малымі і сярэднімі прадпрыемствамі. З беларускага боку была выказана зацікаўленасць у пашырэнні двухбаковага супрацоўніцтва з Польшчай ва ўсіх сферах, што і было зафіксавана ў дакументах другога пасяджэння сумеснай беларуска-польскай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве, якое праходзіла нядаўна ў Мінску.

За адзінаццаць месяцаў мінулага года тавараабарот паміж дзвюма краінамі пад уплывам фінансава-эканамічнага крызісу скараціўся практычна ўдвая і склаў 1 мільярд 435 мільёнаў долараў. І цяпер бакі маюць намер прыкласці максімум намаганняў, каб выправіць гэту сітуацыю. Сярод перспектыўных сфераў беларуска-польскага дзелавога супрацоўніцтва сёння вызначаюцца праекты ў энергетыцы (будаўніцтва электрастанцыі ў Зэльве), нафтагазавай сферы, у хімічнай прамысловасці, чыгуначных перавозках, сельскай гаспадарцы, а таксама магчымасці прымянення польскага вопыту ў сферы прыватызацыі ў Беларусі і па выкарыстанні бурага вугалю ў інтарэсах беларускай энергетыкі.

**Барыс ЗАЛЕСКІ.**

*Бяла-Падляска — Мінск.*


## Архітэктура. Будаўніцтва. Рамонт.




## Лес. Дрэваапрацоўка. Мэбля.







## Тара.Упакоўка. Этыкетка.

